# ПАЧАТАК ПАКЛАДЗЕНЫ

Зусім нядаўна філалагічны факультэт ВДУ імя П.М. Машэрава сумесна з Інстытутам неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта стварылі Цэнтр славянскіх моў і культур. Размесціцца ён у 601-й аўдыторыі галоўнага корпуса нашай ВНУ. Ужо зацверджаны план працы на 2017/2018 навучальны год.

Пры Цэнтры створана рада, у склад якой уваходзяць выкладчыкі і студэнты факультэта, а ўзначальвае яе кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Юрый Міхайлавіч Бабіч.

Асноўная задача Цэнтра – навукова-даследчае і вучэбна-метадычнае супрацоўніцтва нашага філалагічнага факультэта і Інстытута неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта. Гэта важна як для выкладчыкаў, так і для студэнтаў, бо прадугледжвае абмен вопытам у сферах вучэбнай і навуковай дзейнасці, напісанне артыкулаў, сумеснае правядзенне канферэнцый, семінараў, культурных мерапрыемстваў, а таксама абмен студэнтамі і выкладчыкамі.

Сёння «Цэнтр славянскіх моў і культур» прапаноўвае вывучэнне трох моў: беларускай, рускай, польскай. У будучым плануецца ўключыць яшчэ ўкраінскую, чэшскую і славацкую мовы.

**Карына РАХІМАВА,**
**студэнтка 3 курса**
**ФлФ.**